УДК 821.161.3

# ГРАФІЧНЫЯ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ КАНКРЭТЫЗМУ Ў ПОЛІСІСТЭМЕ СУСВЕТНАЙ І БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

**Садко Людміла Міхайлаўна**
дактарант Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)
konovod1@yandex.ru

*У полісістэме сучаснай сусветнай і беларускай паэзіі можа быць адзначаны цэлы шэраг твораў, у якіх актуалізуецца візуалізацыя тэксту з дапамогай графічных элементаў, якія пашыраюць яго семантыку і вобразнасць. Такая тэндэнцыя праяўляе сябе ў творах паэтаў-канкрэтыстаў Р. Доля, Д. Фарнівала, эксперыментах беларускіх аўтараў А. Кавалеўскага, Дз. Дзмітрыева, знаходзіць рэалізацыю у адмове ад лінейнай арганізацыі тэксту, характэрнай для эстэтыкі і паэтыкі дадаізму, сюррэалізму, канструктывізму XX ст.*

Графічныя эксперыменты ў полісістэме сусветнай авангардысцкай літаратуры XX ст. грунтуюцца на досведах папярэдніх напрамкаў і генетычна ўзаемазвязана з многімі сучаснымі літаратурнымі і культурнымі з’явамі. Полісістэма авангардысцкай літаратуры, часткай якой выступае і канкрэтная паэзія, – супярэчлівая, шматвектарная з’ява. У кантэксце еўрапейскага і сусветнага авангарду канкрэтная паэзія звязана з такімі напрамкамі і плынямі сучаснай літаратуры, як дадаізм, сюррэалізм, экспрэсіянізм. У некаторых аспектах канкрэтызм пераплятаецца з футурызмам, канструктывізмам, эстэтыкай поп-арта. У аснове мастацкай стратэгіі дадзеных напрамкаў ляжыць “текстуальная рэвалюцыя”, прызнанне прыярытэтнасці хаосу, двухсэнсоўнасці, гульні ў працэсах сэнсапараджэння. Відавочным чынам эстэтыка канкрэтнай паэзіі ў парадыгме авангарду XX ст. супрацьпастаўлена паняццю рацыянальнасці і іерархічнасці.

Пачынаючы з сярэдзіны 1950-х гг. у літаратурнай полісістэме назіраецца своеасаблівае “пераадкрыццё” дада і сюррэалізму. Так, у 1958 г. з’яўляецца тэрмін “нэадада”, які характарызуе творчасць новых французскіх рэалістаў, групы “Флаксус” (“Fluxus”), дзейнасць Э. Уорхала, Р. Раушэнбер-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

га, Д. Джонса і інш. Сярод атрыманых у спадчыну іншымі напрамкамі авангарду творчых знаходак сюррэалістаў і дадаістаў можна адзначыць прынцып нявызначанасці, выпадковасці ў арганізацыі твораў, метад “псіхічнага аўтаматызму”, актыўнага выкарыстання такога прыёму, як калаж. Для твораў дада і сюррэалізму характэрныя таксама эксперыменты з вербальнымі элементамі (літара, слова, тэкст) з візуальнай і акустычнай пунктаў гледжання. Патрабаванне візуалізаваць выказванне, зрабіць яго акустычна матываваным – адно з прынцыпова важных у канкрэтнай паэзіі. Такія распаўсюджаныя формы канкрэтысцкага пісьма, як фігурныя вершы (ідэаграмы, канстэляцыі, піктаграмы), эксперыменты з варыянтамі шрыфтоў, саўнд-паэмы (партытуры), схемы і структуры, ўзыходзяць да практыкі дадаізму.

Ідучы ў некаторай ступені ўслед за дадаізмам, з яго “аўтаматычным пісьмом”, хаатычным запісам спантанных слоў і урыўкаў маўлення, канкрэтызм вылучае некалькі іншыя аспекты. Узамен ідовішчнасці і мудрагелістай нечаканасці верша дадаізма канкрэтызм прапануе ўдумлівае разгляданне слова, вяртанне яму сэнса. Паэты-канкрэтысты ўвесь час памятаюць пра шчыльную і непарыўную ўзаемасувязь сэнса і гука, гульня ў канкрэтызме – гэта не дадаісцкая “ein Narrenspiel aus dem Nichts” (“дурашлівая гульня ў нішто”) (Х. Баль) [3, s. 98], а пільнае разгляданне існага, “канкрэтнага”. У працэс камунікацыі з чытачом канкрэтысцкі верш уступае шляхам паведамлення структуры твора, якая прыраўноўваецца да зместу. Маляванне словам па паперы літаральна ўвасобіў у сваіх тэкстах паэт-канкрэтыст Р. Доль. У яго творах адбываецца своеасаблівае скасаванне складовага і літарнага пісьма, слову вяртаецца здольнасць служыць візуальнай формай. Адзін з твораў аўтара досыць “аскетычны”, пазбаўлены звыклых сінтаксічных сувязяў, сканструяваны з шматкроць паўторанага слова “apfel” (“яблык”) і аднаго слова “wurm” (“чарвяк”) [5, s. 38]. Замест герметычнай моўнай рэфлексіі аб яблыку, яго асаблівасцях, памерах, форме і г. д. Р. Доль непасрэдна прадэманстраваў матэрыял, стварыўшы адчувальны вобраз, а аднаразовая ўстаўка слова “wurm” падштурхоўвае чытача да разважанняў пра “лыжку дзёгцю ў бочцы мёду”.



Акрамя таго, канкрэтызм творча ўспрымае і кінэтычныя эксперыменты футурыстаў, якія з дапамогай асаблівых колераў і формаў перадаюць дынаміку руху. У творчасці канкрэтыстаў значная колькасць твораў грунтуецца на візуальных эксперыментах, закліканых перадаць кінэтыку прадмета, ідэю руху ў прынцыпе. Цікавыя канкрэтысцкім аўтарам і футурыстычныя пошукі эквівалентаў лінгвістычных знакаў, у радыкальнай форме аж

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

да стварэння новых моў. У паэзіі канкрэтыстаў выкарыстанне геаметрычна выверaных кампазіцыйных пабудоў дэманструе характэрнае імкненне увесці знакі, зразумелыя без тлумачэнняў і перакладу, што характэрна таксама для установак абстракцыяністаў, якія звярнуліся да творчасці на аснове камбінацый геаметрычных аб'ёмаў і плоскасцяў.

Пад "канструкцыяй" канструктывізму і "структурай" канкрэтызму ў самым агульным сэнсе разумеецца нейкі рацыяналістычна абгрунтаваны прынцып кампазіцыйнай арганізацыі твора, у якім на першае месца вылучаюцца такія якасці паэтычнага тэксту, як функцыянальнасць, рацыянальнасць, тэктанічнасць, фактурнасць. Такі падыход да слова яднае канструктывізм і канкрэтызм у полісістэмнай прасторы з дызайнерскім мастацтвам, а бразільская галіна канкрэтызму (група "Нойграндес") – гэта і ёсць аб'яднанне друкароў, дызайнераў, якія выступаюць за выпрацоўку спосабу імгнення і без скажэнняў даносіць інфармацыю.

У 1997 г. малады беларускі паэт А. Кавалеўскі заяўляе аб новым літаратурна-мастацкім метадзе – лагафармізме, які "дазваляе адчуць і зразумець натуральную, першародную субстанцыю вобраза пры дапамозе адзінага і найбольш гарманічнага спалучэння слова і формы ... гэта значыць, што слова (набор слоў) дыктуе форму ..., а форма ў сваю чаргу абумоўлівае размяшчэнне, парадак і агульную гукавую абалонку слоўнага радка, які, дарэчы, можа быць не абавязкова лінейным, а адлюстроўваць круг, квадрат, трохкутнік ці якую-небудзь іншую геаметрычную фігуру" [2, с. 38]. Многія з твораў канкрэтызму і лагафармізму ператвараюцца ў малюнкі, становяцца візуальнымі доследамі, арнаментальным пісьмом.



Тэкст верша "Літарызацыя рукі" [2, с. 38] з'яўляецца своеасаблівай рэалізацыяй моўнай метафары "прыкласці руку" і дазваляе ў літаральным сэнсе ўбачыць руку аўтара: радкі тэксту ўпісаны ў контур далоні.

Яшчэ адзін прыём для перадачы руху ў тэксце ажыццяўляецца ў творчасці беларускага майстра прыгожага пісьменства Дз. Дзмітрыева, аўтара кніг вершаў "Полое собрание сочинений" (2002). Кінэтычныя эксперыменты аўтара аформіліся ў серыю тэкстаў-амбіграм, дзе ў адным візуальным аб'екце пры павароце на 180° або 90° прачытваецца розны тэкст. Такія напісанні

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

могуць называцца ў беларускай практыцы “аркушакрутамі” (тэрмін Ю. Барысевіча. – *Л. С.*). Пры перавароце ў слова з’яўляецца нечаканы схаваны падтэкст, што дазваляе разглядзець слова па-новаму. У канкрэт-практыцы распаўсюджанай з’явай сталі так званыя “devil trap” (“чортавы пасткі”) – нелінейныя тэксты, чытанне якіх магчыма, калі паварочваць твор па пэўнай траекторыі ў прасторы. Унутры аднаго слова ў такіх “пастках” за шрыфтавай або каліграфічнай вяззю можа быць схавана іншае, а пры пароце ліста напісанае можа паўстаць яшчэ адным спосабам, як у тэксце Дж. Фарнівала [4, s. 136].



У некаторых тэкстах Дз. Дзмітрыева прадстаўлены маральныя сентэнцыі “Шэпча каханне: марную ўсе мары”, “Шэпча Сьмерць: людзі ўзвыюць” [1]. Тут тэкст да двукроп’я чытаецца ў адной плоскасці, а пасля яго –пры павароце на 180°. Функцыю пунктуацыйнага афармлення бярэ на сябе чытач, афармляючы інтанацыйную паўзу падчас маніпуляцый з аркушам. Паўната, шматзначнасць, драматызм і экспрэсія мастацкага выказвання праяўляюць сябе ў гэтым эксперыментальным візуальным вершы досыць выразна, а кінэтычныя сродкі толькі ўзмацняюць ўражанне:



Канкрэтная паэзія як важная эстэтычная з’ява другой паловы XX ст. прысутнічае ў літаратурнай полісістэме дадзенага перыяду, прыкметна ўплывае на яго. Варта прызнаць, што ў полісістэме сучаснай сусветнай і беларускай паэзіі выразна праяўляюць сябе літаратурныя групоўкі і накірункі, што ствараюць трансфармаваныя, навацыйныя мадэлі мастацкага тэксту, адмаўляюць традыцыйную структуру тэксту класічнага тыпу. У вершах Р. Доля, Д. Фарнівала, А. Кавалеўскага, Дз. Дзмітрыева актыўнай перабудове падвяргаецца графіка верша, якая доўгі час лічылася адной з канстантных прыкмет паэтычнага тэкста.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Спіс літаратуры**

1. Дзьмітрыеў, Д. Амбіграмы / Д. Дзьмітрыеў // ARHCE [Электронны рэсурс]. – 2007. – № 11(62). – Рэжым доступу: http://arche.bymedia.net/2007-11/dzmitryjeu711.htm. – Дата доступу: 19.05.2014.

2. Кавалеўскі, А. Пачатак логафармізму / А. Кавалеўскі // Першацвет. – 1999. – № 7–8. – С. 38–42.

3. Ball, H. Die Flucht aus der Zeit / H. Ball. – Zürich, 1992. – 156 s.

4. Jandl, E. Poetische Werke : in 11 Bde. / E. Jandl ; hrsg. K. Siblewski. – München : Luhterhand, 1997. – Bd. 4 : Künstliche baum. – 191 s.

5. Konkrete poesie. Deutschsprachige autoren. Antologie von E. Gomringer. – Stuttgart : Philipp Reclam jun., 1996. – 176 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова